## ЛЕГЕНДЫ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

### МІХАСЬ РЫГОРАВІЧ ЛАРЧАНКА

**(1907–1981)**



Прафесар Міхась Рыгоравіч Ларчанка па праву лічыцца адным з вядучых беларускіх літаратуразнаўцаў XX ст. Амаль усё сваё працоўнае і творчае жыццё, ажно да самай смерці ў 1981 г., ён быў звязаны з БДУ, куды паступіў яшчэ ў 1929 г. і дзе з 1955 па 1963 г. узначальваў філалагічны факультэт і адначасова загадваў кафедрай беларускай літаратуры. Пасля навучання ў дактарантуры Інстытута сусветнай літаратуры імя М. Горкага (1952–1955) і абароны там доктарскай дысертацыі (1956) ён стаў першым доктарам філалагічных навук у пасляваеннай Беларусі. Ім апублікавана каля 200 прац, у тым ліку каля 20 кніг і брашур. Пад кіраўніцтвам М.Р. Ларчанкі абаронена каля 50 кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый. Па сутнасці, з 1940-х па 1980-я гг. уключна ў Беларусі не было ніводнага літаратуразнаўца, хто б не вучыўся па падручніках М.Р. Ларчанкі.

Як вучоны, М.Р. Ларчанка з пазіцый народнасці, гуманізму і беларускага патрыятызму даследаваў старажытную беларускую літаратуру і фальклор, развіццё метаду рэалізму ў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX ст. («На шляхах да рэалізму», 1958; «Па шляху рэалізму», 1959), беларуска-іншаславянскія літаратурныя ўзаемасувязі («Славянская супольнасць», 1963; «Яднанне братніх літаратур», 1974), творчасць Ф. Багушэвіча, Цёткі, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Ядвігіна Ш., Алеся Гаруна, Максіма Танка, П. Панчанкі і інш.

Артыкул «Творчасць Алеся Гаруна» быў напісаны і апублікаваны, калі яшчэ не закончылася Вялікая Айчынная вайна. Літаратуразнавец ужо тады (у праграмах і падручніках па літаратуры для ВНУ і сярэдняй школы) у асобных артыкулах (пра Ф. Багушэвіча, Ядвігіна Ш., Алеся Гаруна, Янку Купалу, «Нашу Ніву» і інш.) распачаў пераацэнку нашай літаратурнай спадчыны, ачэрненай і знявечанай вульгарнымі сацыёлагамі тыпу Бэндэ і Кучара яшчэ ў 1930-я гг. На жаль, тады многае М.Р. Ларчанку не ўдалося. Як не ўдалося і творча рэабілітаваць Алеся Гаруна, нягледзячы на асобныя рэверансы ў бок вульгарызатарскай крытыкі. Толькі ў канцы 1980-х гг., калі Міхася Рыгоравіча ўжо не было ў жывых, літаратуразнаўцы вярнулі гісторыі беларускай літаратуры светлую постаць і творчасць аўтара «Матчынага дару».

*В.П. Рагойша*

*М.Р. ЛАРЧАНКА*

## ТВОРЧАСЦЬ АЛЕСЯ ГАРУНА*

Алесь Гарун – таленавіцейшы беларускі паэт. Па сваіх ідэалагічных поглядах і творчаму метаду ён прымыкаў да рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку, галоўнымі прадстаўнікамі якога ў дакастрычніцкі час былі Янка Купала і Якуб Колас. Алесь Гарун быў шчырым патрыётам сваёй радзімы і народа. Ён смела і адкрыта выступаў супраць царскага ладу, патрабуючы для беларускага народа сацыяльнага і нацыянальнага вызвалення. Аднак жыццёвы лёс Алеся Гаруна склаўся вельмі нешчасліва. Само паэтычнае прозвішча гэтага чалавека гаворыць аб тым, што ён многа гараваў, перанёс вялікія пакуты і таму, мусіць, назваў сябе – Гаруном (сапраўднае прозвішча Прушынскі Аляксандр Уладзіміравіч): *Доля мая, – гэта доля гаротная, // Сэрца дала мне, наўчыла любіць // Дый прысудзіла яна ж адваротнае – // Век у сіроцтве, ў выгнанні пражыць*.

Нарадзіўся Гарун у Мінску ў 1887 г., у сям'і рабочага-рамесніка. Яго бацька займаўся сталярскай і цяслярскай працай. Спачатку Гарун вучыцца ў прыходскай школе, а пасля сканчэння яе паступае ў Мінскае рамесніцкае вучылішча, якое заканчвае ў 1902 г. з кваліфікацыяй майстра-сталяра. Некаторы час ён працуе на вытворчасці і энергічна займаецца самаадукацыяй. Пад уплывам рэвалюцыйнага ўздыму з 1904 г. Алесь Гарун бярэ ўдзел у рэвалюцыйным руху, друкуе і распаўсюджвае агітацыйную літаратуру, вядзе прапаганду ў гуртках вучнёўскай і рабочай моладзі. Жывучы некаторы час на вёсцы, ён вядзе агітацыйную работу сярод сялянства, распаўсюджвае пракламацыі з вершамі паэтэсы Цёткі, накіраванымі супраць царызму. Сам Гарун у гэты час таксама пачынае пісаць, відаць пад уплывам Цёткі, свае агітацыйныя вершы.

У 1907 г. за рэвалюцыйную дзейнасць Гарун быў арыштаваны і царскі суд прысудзіў яго да катаргі з заменай яе ссылкай у Сібір. Ссылку Алесь Гарун адбывае ў Іркуцкай губерні, Макараўскай воласці, на рацэ Лене, у 71 вярсце ад г. Кірэнска. Ссылка цягнулася да 1917 г., больш 9 гадоў. Будучы ў ссылцы, у 1914 г. Гарун атрымоўвае права запісацца сялянскім жыхаром і жыць дзе хоча ў межах Сібіры. І ў жорсткіх, невыносных умовах ссылкі не спынялася творчая дзейнасць паэта: ён пісаў вершы на разнастайныя тэмы, больш за ўсё аб сваёй роднай Беларусі.

Гэтыя творы ў 1914 г. былі сабраны Гаруном і склалі зборнік «Матчын дар», які паэтам быў пасланы ў Віленскае беларускае выдавецкае таварыства для надрукавання. Але вайна перашкодзіла выданню гэтай кніжкі Гаруна і яна была выдадзена толькі ў 1918 г.

З ссылкі Алесь Гарун вярнуўся ў сувязі з рэвалюцыяй 1917 г. З Сібіры ён адразу ж прыязджае на сваю радзіму, у родны Мінск. Тут ён трапіў у вельмі складаную абстаноўку класавай барацьбы і, буду-

---

*Упершыню апублікаваны ў часопісе «Беларусь», 1945, № 5, с. 27–30.

чы доўгі час адарваным ад радзімы, рэвалюцыйнага змагання, не змог адразу ж зарыентавацца і правільна зразумець сутнасць Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, якая прынесла свабоду і незалежнасць беларускаму народу, дала яму дзяржаўнасць. Прыехаўшы ў Мінск у 1917 г., Гарун трапляе ў акружэнне нацыянал-дэмакратычнай буржуазнай інтэлігенцыі. Яму вельмі цяжка было распазнаць фальшыва-нацыянальны сцяг беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія прыкрываліся патрыятычнымі лозунгамі, а на справе служылі нямецкім і белапольскім акупантам, прадавалі Беларусь агулам і ўраздроб.

Алесь Гарун у перыяд нямецкай і белапольскай акупацыі заставаўся пасіўным, амаль нічога не пісаў, а калі і пісаў, – дык зусім бяскрыўдныя рэчы, у якіх не было варожасці да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Відаць, Гарун у гэты перыяд свайго жыцця знаходзіўся ў вялікім ідэалагічным замяшанні, балюча перажываў ідэйную неакрэсленасць сваіх думак і пачуццяў, і таму пры адступленні з Мінска белапалякаў, цяжка хварэючы, ён, магчыма, не па сваёй добрай волі ў 1920 г. выехаў з Мінска ў лазарэтным цягніку ў Кракаў і неўзабаве там памёр.

З самой біяграфіі Гаруна відаць, што ён да рэвалюцыі 1917 г. быў актыўным рэвалюцыянерам, а пасля 1917 г., ён, не зразумеўшы сутнасці Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, як і многія прадстаўнікі старой нашай інтэлігенцыі, стаў ахвярай беларускіх нацыяналістаў, трапіў пад іх уплыў, але поўнасцю не раздзяляў іх поглядаў. І таму несправядлівым было б на аснове толькі таго, што Гарун заставаўся пры белапольскай акупацыі, абмінаць яго ў гісторыі беларускай літаратуры.

Беларуска-нямецкія нацыяналісты, гэтыя ланцужныя псы гітлераўскай Германіі, дапамагалі фашысцкім людаедам рабаваць беларускі народ і яго культуру. Каб замаскаваць сваю варожую дзейнасць, яны выстаўлялі фальшыва-нацыянальны сцяг, які імкнуліся прыкрыць творчасцю нашых таленавітых паэтаў і ў тым ліку паэзіяй Алеся Гаруна. Але ўсё гэта рабілася для дымавой заслоны. Калі б Алесь Гарун змог падняцца з магілы і ўбачыць здрадніцкую дзейнасць беларуска-нямецкіх нацыяналістаў, ён сказаў бы ім словамі свайго верша «Юдам», напісанага да рэвалюцыі 1917 г.: *Га! Знаем вас, атручання найміты: // Вы – служкі чорныя Яснейшага Мамона, // Вы – мора бруд ля берага намыты, // Без дум і без мазгоў, вы – золата без звона. // З усіх бакоў на послугі уціску // Чаргою воўчаю з'яўляецеся ўсюды, // Дзе клічуць вас для крыўды, для уціску // На праўду вечную... Вы... імя вам Іуды! // Ідзіце ж проч! Бясплодна ваша трата // На ласкі ліссія. Пакіньце слова: «брат». // Вы – цяжкі сон. Вы – каты... Горайката! // Кругом праклятыя, вам бацька брат-дукат!*

Прыведзеныя радкі з верша «Юдам» сведчаць аб тым, што паэт страсна, усім сэрцам ненавідзеў здраднікаў народа і радзімы. Здрадніцтва – самае цяжкае злачынства ў чалавечым грамадстве. Здраднік – ёсць кат, «горай ката», і гэта «бруд ля берага намыты, без дум і без мазгоў». Гэта вельмі трапнае азначэнне здрадніка. Беларуска-нямецкія нацыяналісты, як вядома, былі такімі здраднікамі, былі крывавымі катамі, брудам, намытым ля берагоў нашай бурлівай эпохі.

Алесь Гарун любіў жыццё, любіў людзей і прыроду, сваё гуманістычнае і паэтычнае крэда Гарун выказаў у праграмным вершы «Людзям», які з'яўляецца ўступам да кніжкі паэта «Матчын дар» (1907–1914 гг.): *Люблю і я скляпенне зор, // Люблю зямлі абшар, // І роўны луг, і ўзгібы гор, // І шум лясны, і чвар. // Люблю жыццё, а ў ім людзей // І кшталты іхніх душ, // Люблю вянкі плясці з надзей, – // А не паэт. – Чаму ж?*

Мастацкім лейтматывам праз увесь гэты верш праходзіць вядомая думка някрасаўскага афарызма: «поэтом можешь ты не быть, но гражданином быть обязан», – паэтычна канкрэтызаваная Янкам Купалам у вершы «Я не паэта». Алесь Гарун, таксама як і Янка Купала, гаворачы, што ён не паэт, гэтым самым сцвярджае ў мастацтве новыя прынцыпы эстэтыкі, эстэтыкі грамадзянскага рэалізму і народнасці. Пясняр – прадстаўнік свайго народа, сваёй нацыі. Ён павінен жыць разам са сваім народам, у сваёй творчасці выказваць яго думы і пачуцці, яго надзеі і мары. Пясняр павінен быць перадавым грамадзянінам свайго часу, сынам сваёй эпохі, барацьбітом з крыўдай-няпраўдай за шчасце народнае. Гэта думка вельмі паэтычна выказана Гаруном у вершы «Паэту». Тут пясняр вядзе эстэтычную палеміку з паэтам, які любіць спяваць аб небе, які адрываецца ад сучаснага жыцця народа, паэтам-рамантыкам, паэтам-ідэалістам. Гарун гаворыць свайму антыподу: «Што кажаш мне, паэт, а праўдзе тэй, што будзе? // Мне сэрца кроіцца ад крыўды нашых дзён»! *Пакінь, пакінь спяваць а праўдзе той, што ў небе! // Яна чужая нам, таемных праўда сіл: // Яна не сходзіць к нам ў канечнае патрэбе, // Калі пакуты дзень так долаг і не міл! // Прашу цябе, мой брат, спявай аб нашым горы, // Аб тым, што ёсць цяпер і што даўней было, // І што на ўсякі твар кладзець, як плуг, разоры, // І што ў мільёнах дум разоры правяло*.

Паэт павінен не толькі праўдзіва адлюстроўваць рэчаіснасць, але выносіць над ёю свой прысуд – гэта думка Чарнышэўскага па-мастацку выказваецца Гаруном у вершы «Малітва»: *Ах, дай мне, божа, гэткіх слоў, // Зямля б ад іх траслася! // … // Пашлю тады маланкі ў люд, // Ў бясчасны той, брадзіці, // Блішчэць, яскравець там і тут, // Праўдзівы гнеў будзіці. // Мільёны кіну перуноў // У тых, каго я знаю. // У тых, маю што сочаць кроў, // У тую чорну зграю.*

Алесь Гарун у сваіх эстэтычных поглядах стаяў на глебе рэвалюцыйна-дэмакратычнага рэалізму рускіх «шасцідзесятнікаў» і беларускіх «нашаніўцаў» купалаўска-коласаўскага напрамку.

Аб тым, што Гарун прымыкаў да купалаўска-коласаўскага напрамку ў нашай літаратуры «нашаніўскага» перыяду, яскрава гавораць радкі паэта з верша, прысвечанага Якубу Коласу: *Усе з аднэй мы вышлі нівы, // І сейбіт нас адзін кідаў, // І кожны з нас той дзень шчаслівы // Ў сваёй душы благаслаўляў // А вецер быў. І хто цяжэйшы, // Астаўся там, куды упаў. // А хто, як я, хто быў лягчэйшы, // Ў далёкі свет павандраваў*.

Алесь Гарун – паэт-філосаф пачуцця, настрою, роздуму аб жыцці, прыродзе, чалавеку, радзіме, свабодзе, вызваленні. Яго філасофія матэрыялістычная. Паэт ставіць пытанні аб сэнсе жыцця, напрыклад: «Нашто, скажы мне, ты жывеш і думкамі якімі?». Адказ на гэтае пытанне даецца паэтам цудоўнымі мастацкімі радкамі: *З аднэю я думкай у свеце жыву, // Настаўнікам ўзяўшы і лес і траву, // Крыніцы і кветкі, і цемру і свет, // І месяц і зоры, і сонца прывет. // Прысуджаны шлях свой рабі дарагім, // Красуйся на радасць сабе і другім*.

Паэт захапляецца магутным зялёным лесам: «Зірні, якая моц! Зірні, які спакой! Штогод ўміраець ён парой асенняй, каб зноў аджыць, убачыўшы вясну», «прыходзь у лес – паветра там глытай». Гэта значыць, гаворачы словамі Фета, «учись у них: у дуба, у березы», вучыся ў прыроды быць моцным і трывалым, не паддавайся роспачы і адчаю, падпарадкоўвайся дыялектычнаму закону жыцця: «Жыві, каб жыццё даць другім, малодшым, як дуб стары, што ўзгадаваў дубка. А там... ручайка знік! І мы пуцём кароткім пайдзём ў зямлю за ім, каб выплысць, як рака».

Вышэйшую радасць жыцця паэт бачыў у вольнасці. Ён страсна верыў у прыход лепшай будучыні, у прыход поўнай сонечнай нацыянальнай і сацыяльнай свабоды для народа і краіны. Уся яго дакастрычніцкая творчасць, – а тварыў ён як паэт толькі да Кастрычніка, – прасякнута аптымізмам, нязгасальнай верай у прыход сонечнай будучыні, у якой «без бяды, без жуды» чалавек «будзе жыць-панаваць, весяліцца». Няхай сабе гэта будзе не так хутка, як бы хацелася паэту, але гэта немінуча будзе: *Не пры нас святы час // Вызвалення людскога настане, – // Мо' праз век чалавек // Да вялікага жыцця устане*.

Алесь Гарун у шматлікіх сваіх творах гаворыць і аб тым, што вызваленне людское настане, што «парвуцца духа путы і будзе ясны дзень да нас тады бліжэй». Часта паэт заклікае галодных і пакутных, абяздоленых людзей на змаганне з крыўдай-нядоляй: *Гэй, хто ёсць тут! Люд галодны. // Люд пакутны! Да мяне! // Станьма, брацця, ў шых паходны, // Наша гора праміне. // Досыць нам з нядолі віці // Ценькі жыцця свайго пас. // Слухай, люд! Прынёс я віці, // Хто за мною, брацця? – Час! // Ўстануць, рушаць: «Проч з дарогі! // Хто нам хоча заступіць? // Мы пайшлі, мы, люд убогі, // Ўсё узяць, ці ўсё згубіць»*.

У вершы «Муляру» Гарун вельмі паэтычна намаляваў карціну будаўніцтва новага жыцця, якое пабудуе чалавек працы. Паэт заклікае муляра кінуць «смерці сховы мураваць, – хай не знаць іх. Уставай ты, пойдзем жыцце будаваць», бо «людзі, як бяздомкі, ходзяць скрозь без уласных хат». Пясняр загадвае ўзяць «кельні, малаточкі, дзве рыдлёўкі, вінкель, шнур», гукнуць людзей і пайсці «класці мур»: *Мур вялікі, вольнай волі, // Мур высокі да нябёс, // Мур братэрства, роднай долі // Мур для радасці без слёз. // … // Сцены зробім чыста, гладка, // Як з крышталю, столь, як шкло, – // Скажуць людзі: «Вось дык хатка! // Роўнай ў свеце не было!»*.

Мур, які жадаў пабудаваць Гарун, увасабляе сабою новае шчаслівае грамадства, дзе не будзе ўціску, эксплуатацыі чалавека чалавекам, дзе будзе свабода, радасць, шчаслівая доля для кожнага чалавека. Такое грамадства пабудавана ў Савецкім Саюзе, і зараз, пасля выгнання нямецкіх драпежнікаў, прычыніўшых нашаму будынку шмат шкоды, гэтае грамадства, «мур вялікі, вольнай волі, мур для радасці без слёз» яшчэ больш умацоўваецца. Мара паэта здзейснена Кастрычніцкай рэвалюцыяй, і таму ён блізкі і актуальны нашай сучаснасці.

Асабліва блізкі нам Алесь Гарун сваім гарачым, глыбока чалавечным патрыятызмам. Гарун быў вялікім патрыётам сваёй радзімы. Доўгачаснае жыццё ў разлуцы з Беларуссю вельмі абвастрыла ў паэта пачуццё радзімы, якое вылівалася ў надзвычай прыгожыя, паэтычна-рамантычныя радкі, у якіх малявалася карціна роднага беларускага краю: *Ты квяцісты, залацісты, // І прыгожы, і аздобны, // Ты лясісты, каласісты, – // Можа рай табе падобны, // Колькі ж моцы маеш скрытай, // Колькі сілы неспажытай!*

Паэт жыў глыбокай верай у сілы сваёй чароўнай радзімы, свайго свабодалюбнага народа, які дасягне патрэбнага шчасця шляхам рэвалюцыйнай барацьбы, напружанай працы: *Ты паўстанеш, працавіты, // Гаратнічы, невымоўны, // Шчасця, долі прагавіты, // Мой сланэчны, мой чароўны. // Будзе час, пабачаць сведкі, // Хоць не мы, дык нашы дзеткі.*

Гарун бязмежна любіў Беларусь. Будучы ў ссылцы, ён у думках сваіх ні на міг не расставаўся з радзімай: *Айчызна, – я ёй у няволі жыву, // Штоноч яе бачу, маўляў, на яву. // За ёю сумую, журуся адно, // Бо шчырым каханнем звязаўся даўно.*

Радзіма, родная Беларусь для Гаруна была вышэй за ўсё. Яму хацелася «зрабіцца крынічкай лясною» з тым, каб бераг роднай зямлі «вадой абмываць, цалаваць», каб «век цэлы дружыці», быць не-

разлучным з радзімай, яе «хвойкі і зоры ў сабе адбіваць». Бязмежная любоў Гаруна да Беларусі была не беспрадметнай, не эстэцкай. Яго патрыятызм быў дзейсным, рэвалюцыйным. Аўтар «Матчынага дару» бачыў, што яго радзіма-маці абяздолена, знаходзіцца пад уціскам царскага самаўладства, «горам замучана, стогнам спавіта ў сецъ ланцугоў, рукі і ногі да слупа прыкручаны». Паэт цвёрда верыў у вызваленне свайго краю, якое прыйдзе ў выніку рэвалюцыі, і, суцяшаючы, гаварыў: *Толькі ж уцешся, матуля каханая! // Слуп твой патроху пачаў падгніваць, – // Прыдзе к нам воля, святая, чаканая, // Сець ланцугоў як пачнем разрываць.*

Алесь Гарун любіў свой народ, яго мову – гэта найкаштоўнейшы скарб духу народнага, патрабаваў захоўваць і шанаваць гэты скарб: *Ты, мой брат, каго зваць Беларусам, // Роднай мовы сваёй не цурайся, // Як не зрокся яе пад прымусам, // Так і вольны цяпер не зракайся. // Дык шануй, Беларус, сваю мову // Гэты скарб нам на вечныя годы; // За пашану радзімаму слову // Ушануюць нас брацця-народы.*

Алесь Гарун быў вялікім майстрам паэтычнай дасканаласці лірычнага верша. Мастацкая сканцэнтраванасць думак і пачуццяў, сціпласць і выразнасць слоўна-маляўнічых сродкаў, напружная эмацыянальнасць, фальклорная прастата, рытмічная і метрычная разнастайнасць, народная напеўнасць – вось тыя асноўныя паэтычныя якасці, што характарызуюць сабой шматлікія вершы грамадзянскай і філасофскай, любоўнай і пейзажнай лірыкі Алеся Гаруна.

Алесь Гарун быў не толькі арыгінальным лірыкам. Ён напісаў рад такіх эпічных твораў, як «Новая песня», «Шчасце Мацея», «Каму што», «Канец Паўлючонка», «Варажба», дзе цікава паказана тэма народна-беларускага жыцця. Апрача гэтага, А. Гарун напісаў некалькі празаічных твораў і п'ес для дзяцей. Усё гэта складае літаратурную спадчыну Алеся Гаруна, якая заслугоўвае ўвагі і сур'ёзнага вывучэння.

*Публікацыю падрыхтаваў В.П. Рагойша,*
*кафедра тэорыі літаратуры*